КУЛЬТУРА НАЦЫЯ

www.sakavik.net

# Рэспубліка Беларусь – дзяржава ў цэнтры Еўропы

**Геаграфічнае размяшчэнне Рэспублікі Беларусь дазваляе ёй з выгадай развіваць транспартныя патокі ў Еўропе ў напрамках Усход-Захад і Поўнач-Поўдзень, выкарыстоўваючы міжнародныя аўтамабільныя дарогі Е28, Е30, Е85, Е95, Е271. У Беларусі больш за 50 тыс. км дарог агульнага карыстання.**

**Дзяржаўная мяжа Беларусі складае 3618 км. Працягласць мяжы з суседнімі краінамі: з Украінай - 1084 км, з краінамі ЕС – 1251 км (з іх з Латвіяй – 173 км, з Польшчай – 399 км, з Літвой – 679 км), з Расіяй – 1283 км. Працягласць тэрыторыі рэспублікі з поўначы на поўдзень 560 км, з захаду на ўсход 650 км.**

**Паводле колькасці насельніцтва Рэспубліка Беларусь займае 17-е месца ў Еўропе. Плошча – 207,6 тыс.кв.км. Паводле плошчы сваёй тэрыторыі Беларусь займае 12-е месца ў Еўропе і перасягае такія еўрапейскія краіны, як Грэцыя, Партугалія, Аўстрыя, Нідэрланды, Бельгія, Чэхія, Літва, Латвія, Эстонія і інш.**

